Школа падаткаплацельшчыка

# Падатковая льгота для бацькоў на дзіця-інваліда падвойваецца

**На пытанні чытачоў «Звязды» рэдакцыі адказвае старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Аляксандр Зялеўскі.**

***— Мы з жонкай выхоўваем двух дзетак ва ўзросце — адзін і восем гадоў. Старэйшы сын прызнаны інвалідам. У якім памеры вызначаюцца стандартныя падатковыя вылікі бацькам на дзетак у такім выпадку? Памер такіх вылікаў будзе 2 базавыя велічыні (БВ) плюс 4 БВ, ці 4 БВ плюс 4 БВ?***

**Алесь КАЛІНА,** *г. Маладзечна, Мінская вобласць.*

— У адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў», пры вызначэнні памеру падатковай базы плацельшчык мае права на атрыманне стандартнага падатковага выліку ў памеры двух базавых велічынь на кожнае дзіця да 18 гадоў і (або) кожнага утрыманца за кожны месяц падатковага перыяду. Стандартны падатковы вылік ажыццяўляецца на падставе даных пашпарта, копіі пасведчання аб нараджэнні дзіцяці. Разам з тым, пунктам 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 красавіка 2007 года № 162 «Аб некаторых пытаннях прымянення льгот і вылікаў па падаходнаму падатку з фізічных асобаў» вызначана, што плацельшчыкі падаходнага падатку з фізічных асобаў, якія з'яўляюцца бацькамі дзяцей-інвалідаў, маюць права на атрыманне ў вызначаным парадку стандартнага падатковага выліку ў памеры чатырох базавых велічынь на кожнае дзіця ва ўзросце да 18 гадоў за кожны месяц падатковага перыяду. Такім чынам, бацькам, якія выхоўваюць двух дзетак, адно з якіх прызнана інвалідам, даецца падатковая льгота ў памеры шасці базавых велічынь (2 БВ плюс 4 БВ).

***— Ці абкладаецца падаходным падаткам у 2007 годзе дапамога па часовай непрацаздольнасці, якая была выключана ў выніку няшчаснага выпадку на вытворчасці, і прызначацца ў сувязі са страхавым выпадкам?***

**Кірыл КАНАВЕЦ,** *г. Мінск*

— У адпаведнасці з Законам ад падаткаабкладання вызваляюцца дапамогі па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню і сацыяльнаму забеспячэнню і надбаўкі да іх, акрамя дапамог па часовай непрацаздольнасці (у тым ліку дапамог па догляду за хворым дзіцем), дапамогі па беспрацоўю, субсідыі для кампенсацыі расходаў беспрацоўных у сувязі з арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці, якія выплачваюцца з Дзяржаўнага фонду садзейнічання занятасці, дапамогі, якія выплачваюцца са сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Такім чынам, дапамогі па часовай непрацаздольнасці не вызваляюцца ад падаткаабкладання. Разам з тым, пры вызначэнні падатковай базы не ўлічваюцца даходы, атрыманыя ў выглядзе страхавой кампенсацыі і (або) забеспячэння ў сувязі з наступленнем адпаведных страхавых выпадкаў:

— па дагаворах абавязковага страхавання, якое ажыццяўляецца адпаведна заканадаўству Рэспублікі Беларусь; па дагаворах добраахвотнага страхавання, па якіх страхавыя ўзносы (страхавыя прэміі) былі ўнесены плацельшчыкам за кошт уласных сродкаў і (або) асобамі, указанымі ў пункце 2 артыкула 2 Закона;

— па дагаворах добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і хвароб на час паездкі за мяжу, добраахвотнага страхавання грамадзянскай адказнасці і наймальніка за шкоду, якая была прычынена жыццю ці здароўю работніка, добраахвотнага доўгатэрміновага (на тэрмін не менш трох гадоў) страхавання жыцця, а таксама па дагаворах добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў (калі такія дагаворы былі заключаны на тэрмін не менш аднаго года).

***— Я выхоўваю трох дзетак ва ўзросце да 18 гадоў. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 красавіка 2007 года № 162 маю права на атрыманне стандартнага падатковага выліку ў памеры чатырох базавых велічынь на кожнае дзіця. Аднак згодна з Законам аб падаходным падатку мне, як удаве, стандартныя падатковыя вылік даецца ў двайным памеры. Ці сапраўды я зараз маю права на стандартны вылік у памеры 8 базавых велічынь (БВ) на кожнае дзіця?***

**Алена Пятроўна,** *г. Магілёў.*

— Згодна з законам плацельшчык мае права на атрыманне стандартнага падатковага выліку ў памеры двух базавых велічынь на кожнае дзіця да 18 гадоў. Удовам (удаўцам) дадзены стандартны падатковы вылік даецца ў двайным памеры. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 162, бацькі шматдзетных сем'яў маюць права на атрыманне стандартнага падатковага выліку ў памеры 4 БВ на кожнае дзіця ва ўзросце да 18 гадоў за кожны месяц падатковага перыяду. Улічваючы, што спадарыня Алена мае трох дзетак, то вылікі ёй павінны разлічвацца як шматдзетнай маці згодна Указа № 162, які мае вышэйшую юрыдычную сілу; вылік гэты адпавядае памеру чатырох базавых велічынь на кожнае дзіця.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

## СЛУЖУ АЙЧЫНЕ!

**12 жніўня ў Барысаве ў 72-м гвардзейскім Аб'яднаным навучальным цэнтры адбылася цырымонія прыняцця прысягі з удзелам міністра абароны Беларусі генерал-палкоўніка Леаніда Мальцава. 727 абаронцаў Айчыны, 465 з якіх будуць праходзіць службу ў рэзерве, прысягнулі ў гэты дзень на вернасць Радзіме. Па традыцыі павіншаваць маладых воінаў у цэнтр прыбылі родныя і блізкія салдат, мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый. У ходзе летняга прызыву ва Узброеныя Сілы, пагранічныя, унутраныя войскі і воінскія фарміраванні Рэспублікі Беларусь было накіравана амаль 10 тыс. прызыўнікоў. Яшчэ каля 3 тыс. чалавек будуць праходзіць службу ў рэзерве.**

**Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.**





## Доктар адкажа

### Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (227-70-80) будуць дзяжурыць:

**14 жніўня** — першы намеснік дырэктара РУП «Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя» Уладзімір Вячаслававіч Зянькевіч;

**15 жніўня** — намеснік дырэктара па навуковай рабоце НДІ медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі Таццяна Міхайлаўна Ляшчынская;

**16 жніўня** — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Аэліта Віктараўна Шчын;

**17 жніўня** — намеснік дырэктара РНПЦ «Маці і дзіця» Алена Альбертаўна Улезка.

У графіку магчымыя змяненні.

## БЕЛАРУСЬ УВОДЗІЦЬ АБМЕЖАВАННІ НА ЎВОЗ МЯСНОЙ ПРАДУКЦЫІ Ў БАГАЖЫ І РУЧНОЙ ПАКЛАЖЫ

**Беларусь з 11 жніўня ўводзіць часовыя абмежаванні на ўвоз мясной прадукцыі ў багажы і ручной паклажы, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў галоўным упраўленні ветэрынарыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Такое рашэнне прынята ў сувязі з абвастрэннем эпізаатычнай сітуацыі ў многіх краінах свету па захворваннях сельскагаспадарчых жывёл і птушак, такіх як яшчур, афрыканская чума, птушыны грып, хвароба Ньюкасла. Гэтыя хваробы хутка распаўсюджваюцца.

З 11 жніўня ўзмоцнены кантроль за мяснымі прадуктамі, што ўвозяцца ў Беларусь любым відам транспарту. Сумесна са спецыялістамі Дзяржаўнага мытнага камітэта і ДУ «Беларускае ўпраўленне дзяржветнагляду на дзяржаўнай граніцы і транспарце» будуць праводзіцца праверкі багажу і ручной паклажы на прадмет правозу забароненай прадукцыі. Што датычыцца вывазу мясной прадукцыі з Беларусі, то пасажыры, якія адпраўляюцца ў далёкую дарогу, павінны будуць падпарадкоўвацца тым правілам, якія дзейнічаюць на тэрыторыі той або іншай дзяржавы.

## Кватэрнае пытанне

### ПЕРШ ЧЫМ ІСЦІ Ў СУД

***Многія не паспелі альбо па старасці ці па хваробе не змаглі перарэгістраваць чэкі «Жыллё» і зараз вымушаны траціць грошы, хадзіць па судах. А ёсць людзі, якія па стану здароўя не могуць дазволіць сабе ні таго ні другога. Што тады рабіць? Ці не гуманней было б проста прадоўжыць дзеянне чэкаў «Жыллё»?***

**Г.Ф. САРКОВА,** *г. Старыя Дарогі.*

***Я ў свой час атрымаў належныя мне і членам маёй сям'і чэкі «Жыллё». Зараз узнікла неабходнасць выкарыстаць іх. Але ў выканкаме мне адказалі, што гэта немагчыма, бо чэкі не былі перарэгістраваны (апошнія 3 гады ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў я знаходзіўся за межамі краіны). Ці ёсць нейкія варыянты вырашэння праблемы, якая ўзнікла?***

**Л.Г.,** *г. Брэст.*

Перарэгістрацыя імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» была прадугледжана ў мэтах упарадкавання іх абарачэння і выкарыстання. Дэкрэтам кіраўніка дзяржавы ад 7 чэрвеня 2005 года № 6 былі вызначаны парадак і тэрмін правядзення перарэгістрацыі — да 1 студзеня 2006 года. Затым, Дэкрэтам ад 28 студзеня 2006 года № 1 гэты тэрмін быў зменены і ўстаноўлена, што ўсе чэкі, якія знаходзяцца ў грамадзян, падлягаюць перарэгістрацыі ў ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» да 1 студзеня 2007 года. Гэтым жа Дэкрэтам было прадугледжана, што пасля 1 студзеня 2006 года знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё».

У дадзеных выпадках, паколькі ўстаноўлены агульны тэрмін перарэгістрацыі прайшоў, можна выкарыстаць норму, прадугледжаную падпунктам 1.1 Дэкрэта ад 7 чэрвеня 2005 года № 6. Калі перарэгістрацыя чэкаў «Жыллё» была немагчыма з-за хваробы іх уласніка або адсутнасці яго ў Рэспубліцы Беларусь, устаноўлены тэрмін перарэгістрацыі падаўжаецца на час хваробы або адсутнасці. Асобам, якія не перарэгістравалі належныя ім чэкі «Жыллё» па іншых уважлівых прычынах, дадзены тэрмін можа быць падоўжаны па рашэнню суда, калі іск аб гэтым прад'яўлены ў суд на працягу агульнага тэрміну іскавай даўнасці.

**Віктар САВІЦКІ.**

### КАЛІ МЕТРАЎ МЕНШ...

***Мы з дарослай дачкой жывём у аднапакаёвай кватэры, якая належыць яе бацьку, гэта значыць, майму былому мужу. Сам ён тры гады ўжо як з'ехаў ад нас, жыве з іншай жанчынай. Пытанне: ці можа наша дачка стаць на кватэрны ўлік?***

**З.В.,** *г. Віцебск.*

У адпаведнасці з падпунктам 3.1.1. Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 года № 565), грамадзянамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прызнаюцца тыя, хто не мае ва ўласнасці або ў карыстанні жылых памяшканняў у дадзеным населеным пункце.

Але ў дадзеным выпадку ў маці з дачкой знаходзіцца ў карыстанні жылое памяшканне, якое належыць на праве ўласнасці былому мужу. Заканадаўча іх права па карыстанню жылым памяшканнем замацавана ў артыкуле 116 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з указаным артыкулам, калі члены сям'і ўласніка жылога памяшкання перасталі быць членамі яго сям'і, але працягваюць пражываць у гэтым жылым памяшканні, яны захоўваюць свае правы і абавязкі, калі іншае не ўстаноўлена заключаным з ім пісьмовым пагадненнем аб парадку карыстання жылым памяшканнем.

Як вынік, паўналетняя дачка можа быць прынята ва ўстаноўленым парадку на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, калі, у прыватнасці, забяспечанасць агульнай плошчай жылога памяшкання (у якім яна пражывае разам з маці) складае менш як 15 кв. метраў на аднаго чалавека.

**Віктар САВІЦКІ.**

# ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ




## Караткевіч і дом № 7

Пяціпавярховы дом №7 на вуліцы Чарнышэўскага, дзе на пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя жыў і Караткевіч, памятаю выдатна. Толькі вось да суседа Уладзіміра я тады мала прыглядаўся, хоць і жылі мы на адной лесвічнай пляцоўцы. Ён у кватэры пад нумарам 56, а наша сям'я пад нумарам 58. А прыглядаўся я мала таму, што ў нашым доме жыло шмат яркіх і запамінальных асобаў, значна ярчэйшых за сціплага і выхаванага маладога літаратара Валодзю Караткевіча, так яго ўсе называлі ў нашым пад'ездзе. Цяпер з усіх жыльцоў нашага дома са шчаслівым нумарам, самы папулярны — Караткевіч, а тады былі іншыя папулярныя асобы. Сям'я танцораў Бабачкіных была настолькі папулярная, што нават за мяжу ездзіла выступаць, а па горадзе тая сям'я гойсала на матацыкле «Ява». Уяўляеш, як мяне ўражваў матацыкл? А яшчэ мяне ўражвалі ногі Мальцінскай. Яна так шырока расстаўляла ногі, калі грала на скрыпцы, што здавалася ў яе трэсне спадніца. Ногі Мальцінскай запомніліся на ўсё жыццё, такіх малочна-блакітных ног, што сама-ўпэўнена стаяць на чыста вымытых дошках нефарбаванай падлогі, я больш у сваім жыцці і не пабачыў. Клянуся патэнцыяй. Твар Мальцінскай не памятаю, ён неяк размыўся ў маёй памяці, а твар яе таты папомніцца добра. Твар мудрага знаўцы яўрэйскай мовы і цяпер выразна паглядае на мяне праз вялікія акуляры з адлегласці ў сорак гадоў. Хаім Мальцінскі перакладаў з беларускай мовы на ідыш. Перакладаў апавяданні майго таты, пэўна, і апавяданні Караткевіча ён тады перакладаў для часопіса «Зорка». Некалькі тых часопісаў захоўваюцца ў мяне і цяпер, на добры ўспамін пра сям'ю Мальцінскіх. Як захоўваюцца ў мяне і фотакарткі Міхася і Галіны Стральцовых, што таксама жылі ў нашым доме, на першым паверсе. Галя Стральцова лічыла сябе самай прыгожай жанчынай у нашым двары. Я з ёю не спрачаўся, але, зразумела, што самая прыгожая была мая мама. А самым непрыгожым чалавекам у тым доме быў мужчына з сінім тварам. Недзе на фронце яму твар пабіла порахам. Уся скура была нібыта прыцярушана шэра-сінімі кропкамі-рабацінкамі. Сінятварага мы, дзеці, пабойваліся. Ды што там пабойваліся, мы яго жахаліся моцна. Такога жывога нябожчыка сустрэнеш вечарам у пад'ездзе, сам забаішся. А Караткевіча мы не баяліся, нават калі ён быў нападпітку, бо Караткевіч сам пабойваўся дзяцей, а таму дарыў нам розную драбязу і частаваў цукеркамі. А сусед Алешка нас нічым не частаваў, але мы яго паважалі, бо ў яго была форма марскога афіцэра і меўся корцік. Патрымаць у руцэ сапраўдны корцік — мара кожнага хлопчыка. Хіба не? У Язэпа Пушчы корціка не было, але мужнасці ў яго мелася на трох мужчын. Ён прайшоў канцэнтрацыйныя лагеры і вярнуўся, гэта ж так важна — вярнуцца. Хай мне даруюць усе, хто быў расстраляны і хто загінуў за калючым дротам савецкіх лагераў, але трэба было вярнуцца і прынесці нашу беларускую ідэю дамоў. Пушча вярнуўся. Жалезны чалавек. Ніхто ніколі не спытаўся ў мяне пра Язэпа Пушчу. Зрэшты, ніхто ў мяне і пра Кашапарава не пытаўся. А Кашапараў, безумоўна, самы праслаўлены чалавек з нашага дома на вуліцы Чарнышэўскага. Кашапараў спяваў у легендарным складзе «Песняроў». Мільёны слухачоў падпявалі Кашапараву. Асаблівай народнай любоўю карысталася песьня пра Волагду, пра дом, пра лісты да каханай. Пра Кашапарава ніхто ў мяне не спытаў мо таму, што я мала магу пра яго расказаць. Хадзіў па нашаму двару хлопчык у спартовых штанах з выцягнутымі каленямі. Насіў той хлопчык папку з нотамі. Мама ў таго хлопчыка працавала машыніcткаю. Падпрацоўвала тым, што передрукоўвала з рукапісаў апавяданні маладых літаратараў. Друкавала яна і татавы навелы, мусіць і апавяданні Валодзі Караткевіча друкавала. Дом у нас лічыўся пісьменніцкім, бо літаратараў там жыло сапраўды шмат. Дзеружынскі, Пташнікаў, Папоў, Махнач... Алесь Махнач бараніў Брэсцкую крэпасць, яго там і параніла ў нагу. Махнач хадзіў з кавенькаю. Ён і ў школу да нас прыходзіў з кавенькаю і распавядаў пра нямецкія агнямёты, ад якіх нават цэгла плавілася і аплывала. Караткевіч пра агнямёты не распавядаў, але мяне ўсе распытваюць менавіта пра дзядзьку Валодзю. Таму я і распавёў пра людзей, якія жылі побач з Караткевічам. Гэта істотна, ведаць пра асяродак, ведаць пра кантэкст, у якім жыў і працаваў літаратар. Я так лічу, бо для мяне важна, што я жыў на адной лесвічнай пляцоўцы з Караткевічам. А вось сам будынак ніякай каштоўнасці з сябе не ўяўляе, і, калі дом № 7 знясуць, я шкадаваць не буду, больш за тое, узрадуюся, што нарэшце разбурылі крывую халабудзіну, якая была неахайна складзена з крохкіх блокаў. Столь на апошніх паверхах заўсёды цякла, пэўна яна і зараз працякае. Якое шкадаванне? А тое, што ў тым доме працавалі выбітныя людзі, зусім не апраўдвае такую доўгую прысутнасць гэтай пяціпавярховай развалюхі ў нашым архітэктурным свеце.

## Джойс і Уліс

Пра ўсё ўжо напісалі. Усе дарогі пройдзеныя. Хто можа параўнацца з Улісам? Што можна параўнаць з ягоным караблём «Calipolis»? Хто напіша пра Уліса лепей за Гамера? З такімі змрочнымі думкамі я выходжу са свайго гатэля «Calipolis», каб прайсціся па барселонскіх бульварах. Барселона — сталіца Міжземнамор'я. Тут я спадзяюся знайсці адказы на свае змрочныя пытанні пра марную марнасць існага. Іду па Ла Рамбласу і бачу Джойса. Джэймс Джойс сядзіць на хісткім крэсле і чытае. Джойс зноў перачытвае бессмяротнага Гамэра, перачытвае «Адысею», каб напісаць раман «Уліс». Так, на Ла Рамбласе ёсць жывая скульптура срэбнага колеру і аблічам Джэмса Джойса. Артыст стварыў вобраз паэта Джойса. І яму за гэта кідаюць манеткі ў бляшаны кубак. А што стварыў Джэймс Джойс? Уліса? Дык пра яго ўсё, што магчыма, праспяваў сляпы Гамер. Дык што тады напісаў Джойс? Джэмс Джойс напісаў Джэмса Джойса! Так. Ёсць літаратары, якія здатныя напісаць пра некага, а ёсць і такія, што могуць стварыць сябе. Джойс стварыў сябе, па абрысу і падабенству Уліса. А што яму яшчэ заставалася пісаць, калі ўсе кнігі былі напісаны раней, яшчэ задоўга да ягонага нараджэння? Напісаць Джэймса Джойса з горада Дублін. Напісаў і зноў вярнуўся ў чытачы. Не найгоршы гэта занятак — быць чытачом. І чытаць, чытаць, чытаць да поўнай паэтычнай слепаты.

**Адам ГЛОБУС.**

## ПАТЭЛЕФАНУЙ МНЕ НА...ТАКСАФОН

**Філіял «Мінская гарадская тэлефонная сетка» РУП «Бэлтэлекам» укараніў у доследна-прамысловую эксплуатацыю паслугу «Уваходная сувязь на таксафон». Упершыню таксафоны з уваходнай сувяззю з'явіліся ў Брэсцкай вобласці, а з 1 жніўня падобная паслуга пачала аказвацца ва ўсіх абласцях.**

Таксафон, які здольны прымаць уваходныя званкі, можа стаць незаменным сродкам сувязі ў многіх жыццёвых сітуацыях. З такога таксафона мінчане могуць самі набраць нумар сваякоў, сяброў ці калег і папрасіць іх патэлефанаваць ім на тэлефонны нумар таксафона або дамовіцца, што ў пэўны час яны будуць чакаць званка побач з таксафонам. Аплачвае паслугу той, хто тэлефануе на таксафон. Тарыфікуюцца званкі на таксафон таксама, як і званкі на звычайны гарадскі тэлефон: 1 хвіліна тэлефонай размовы па гораду каштуе 8 рублёў, у межах вобласці — 20 рублёў і 41 рубель — у межах краіны (пры званках са стацыянарных тэлефонаў). Тэлефанаваць на таксафон можна і з мабільнага тэлефона.

Над таксафонамі з уваходнай сувяззю размешчаны наклейкі з надпісам «Таксафон з уваходнай сувяззю» і ўказаннем яго нумара. Акрамя таго, усе таксафоны з уваходнай сувяззю і іх нумары можна знайсці на сайце www.mgts.beltelecom.by, або атрымаць патрэбную інфармацыю ў даведачным цэнтры абслугоўвання кліентаў РУП «Белтэлекам» па тэлефоне «130». Калі званкі ажыццяўляюцца ў межах сталіцы, трэба набіраць сямізначны нумар таксафона. А жадаючыя патэлефанаваць у Мінск на таксафон з іншага горада ці са свайго мабільнага тэлефона, павінны набраць 8-017 і непасрэдна нумар таксафона.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## «Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

### У ДАДЗЕНЫМ ВЫПАДКУ МЯТА І МЕЛІСА НЕ МЕДАНОСЫ, А ПУСТАЗЕЛЛЕ

**З вёскі Церабуты Старадарожскага раёна на «гарачую лінію» газеты патэлефанавала пенсіянерка — жыхарка цэнтральнай вуліцы, што пражывае ў прыватным доме.**

— Мы трымаем пчол. А на вуліцы ўздоўж нашай агароджы растуць такія патрэбныя ім меданосы — мята і меліса. Мы іх спецыяльна не саджалі, але і не знішчаем. Але вось днямі камісія, якая адказвае за добраўпарадкаванне населенага пункта, сказала: расліны знішчыць. Быў у яе саставе і ўчастковы, які папярэдзіў, што, калі не выканаем прадпісанне, накладуць штраф, — гаварыла жанчына.

Як мы ўжо зазначылі вышэй, пенсіянерка пражывае на цэнтральнай вуліцы вёскі, значыць, усе магчымыя хібы ў плане парадку на прылеглай да дома тэрыторыі адразу кідаюцца ў вочы. Гэта нам пацвердзілі ў Шчыткавіцкім сельскім Савеце, да якога адносіцца вёска Церабуты.

— Памянёныя мята і меліса нагадваюць звычайнае пустазелле, паколькі ніяк не аформлены — няма ні клумбы, ні дэкаратыўнай агароджы, ні хоць бы якіх каменьчыкаў у выглядзе аздаблення. Усё гэта псуе выгляд, таму санітарная камісія і звярнула ўвагу на гэты непарадак, — паведамілі нам у сельскім Савеце.

— Пакуль гаспадарам дома вынесена толькі папярэджанне і дадзены тэрмін для выпраўлення хібаў у плане добраўпарадкавання прылеглай да домаўладання тэрыторыі вуліцы, — пацвердзіў нам участковы інспектар міліцыі Старадарожскага РАУС Сяргей Субатовіч, які абслугоўвае тэрыторыю сельскага Савета. — Зазначу, што прадстаўнікі санітарнай камісіі звярнулі ўвагу не толькі на пустазелле ўздоўж агароджы, але і на раскіданае ў ім бытавое смецце. Прызначана паўторнае абследаванне тэрыторыі, і, калі гаспадары нічога не зробяць, на іх можа быць накладзена адміністрацыйнае пакаранне — штраф ад 3 да 5 базавых велічынь. Зразумейце, каб там была аформлена прыгожая клумба з кветкамі, іншымі раслінамі, камісія толькі б вітала такое добраўпарадкаванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Барыс Васільевіч Стральцоў — доктар філалагічных навук, прафесар факультэта журналістыкі БДУ, па падручніках якога ўжо некалькі дзесяцігоддзяў вучацца студэнты-журналісты, — таксама наш, звяздовец. Ён працаваў у газеце з 1958 па 1969 гады.**

**Сёлета Барыс Стральцоў выдаў кнігу «Капуснік, або Лад жыцця» — гэта літаратурная кампазіцыя, заснаваная на памкненні спыніцца, азірнуцца на пройдзены шлях, падвесці рахунак зробленага. У кнізе нямала эпізодаў, звязаных са «Звяздой». Вось асобныя з іх.**




Барыс СТРАЛЬЦОЎ

## ХТО ЯРЧЭЙ ГАРЫЦЬ...

Дванаццаць гадоў у калектыве «Звязды». У спаяным, дружным калектыве высокай пробы! Азіраешся праз гады і паўстаюць перад вачамі твары старэйшых таварышаў, паплечнікаў-аднагодкаў, маладых хлопцаў, якія, скончыўшы факультэт журналістыкі, ці то адразу, ці то набыўшы творчы вопыт у іншых газетах, сталі звяздоўцамі.

Працаздольнасці і акуратнасці намесніка рэдактара Мікалая Якаўлевіча Філімонава можна было пазайздросціць. Па яго з'яўленні на рабочым месцы можна было звяраць гадзіннік. А вось выхад з рэдакцыі — гэта як атрымаецца, як складуцца абставіны. У яго быў дзівосны дар знаходзіць памылкі на гатовых палосах. Яны падпісваліся да друку паасобку. Здаецца, усё гатова, можна падпісваць, а ён зойдзе, гляне і тыцне пальцам у адну калонку, у другую: «Ну што вы, мае даражэнькія, прапусцілі такія памылкі, яны ж навідавоку». А там, бывала, усяго «відавоку», што няма коскі.

Адказны сакратар Іван Паўлавіч Сіманоўскі, мужчына моцнага целаскладу, вызначаўся знешняй самавітасцю. А за гэтай самавітасцю хаваўся энцыклапедыст, гумарыст і анекдотчык. Да яго хадзілі за даведкамі: дзе, што, калі, каму. А ўжо наконт гісторый з журналісцкага жыцця, дык такога майстра іх расказваць трэба было пашукаць.

З маладых мне бліжэй быў Сымон Блатун. Усявышні не абдзяліў яго талентамі. Ён і журналіст, і паэт, і мастак. У журналістыцы Сымон не абмяжоўваўся адной тэмай, адным жанрам. Трэба газеце нарыс — калі ласка! Трэба тэрмінова крытычная карэспандэнцыя з раёна, рэпартаж, інтэрв'ю — няма праблем! А вось у паэзіі для яго галоўнымі былі бацькоўская хата, родны кут, брагінская зямля, Палессе <...>

І Мікола Філімонаў, і Іван Сіманоўскі, і Франц Ляпескі (якога нельга не памянуць), і Соф'я Садоўская заўчасна пайшлі ў Вечнасць. Журналіст кладзе на сваё сэрца ўсе ліхтугі свайго народа, а таму яго век бывае нядоўгі. Хто ярчэй гарыць, той хутчэй згарае.

## БОРШЧ ВІНАВАТЫ

Рэдактар «Звязды» Васіль Андрэевіч Пыжкоў вельмі патрабавальна ставіўся да нашых твораў. Калі не па яго — прымушаў перарабляць. Пакуль не давядзеш да кандыцыі. А наконт загалоўкаў дык увогуле суцэльная марока. На так званыя «ўдарныя» артыкулы і нарысы, якія вызначалі «твар» газеты, патрабаваў прынесці яму сем-восем варыянтаў. Па свайму густу выбіраў лепшы.

Раптам з гэтымі варыянтамі выйшла палёгка. Вектар рэдактарскага інтарэсу павярнуўся ў другі бок — на вёрстку і афармленне. Тут ужо асноўны цяжар лёг на сакратарыят. Іншым разам на абмеркаванне варыянтаў вёрсткі палос запрашаў усю рэдкалегію.

Сядзім мы аднойчы, абмяркоўваем. Побач з рэдактарам сядзіць загадчык аддзела ілюстрацыі. Перабірае фотаздымкі, падсоўвае рэдактару лепшыя.

Васіль Андрэевіч слыў непітушчым. Як той палясоўшчык з паэмы «Тарас на Парнасе», «гарэлкі ў губы ён не браў». Але нос меў адмысловы — тоўсты і шышкаваты, добра настроены на пахі.

Павольна нацэльвае ён свой нос, як дубальтоўку, на ілюстратара і грозна пытаецца:

— Ад каго гэта так патыхае?

Той, збянтэжаны, адсоўваецца і тонкім дыскантам ляпеча:

— Гэта я боршч еў.

— Ага, еў боршч, а тхне гарэлкай?!

Ушчэнт збянтэжаны хлопец, ведаючы, чым усё гэта пахне, ляпнуў у адказ неверагоднае:

— Дык я дзве талеркі баршчу з'еў.

Усе, гледзячы на рэдактара, застылі з разяўленымі ратамі. А той, седзячы, з грукатам адсунуў крэсла, ускочыў і, зацiснуўшы рот рукой, порстнуў у пакойчык для адпачынку — быў такі пры кабінеце, мы яго чамусьці звалі рэдактарскім пацешнікам.

Уздыхнулі з палёгкай: пасмяецца сам-насам і вернецца ў добрым гуморы. Значыць, пранесла!..

# ШЭЙХ САІД — НЕ ПРОМАХ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Шэйх Саід прыехаў на «поле бою» на серабрыстым «мерседэсе» класа «S», а замест велічнага абмундзіравання — чырвоны касцюм і белая кепка. І што самае дзіўнае — ніякой самазадаволеннасці! Красоўкі на ім былі самыя звычайныя. Пасля некалькіх дзён спаборніцтваў і бясконцых пераходаў з месца на месца — злёгку патрапаныя.

Я ўпершыню адчула два пачуцці — шок і захапленне. За метр ад мяне спакойна разгульвае шэйх з ружжом на плячы, зусім не думаючы аб уласнай бяспецы. А раптам я апынуся звар'яцелай фанаткай, кінуся яму на шыю і стану цалаваць? Пільна сачыла за кожным яго рухам, поглядам, манерай зносінаў з людзьмі, нарэшце, стральбой па мішэнях. Мне хацелася даведацца, аб чым ён зараз думае, што ў яго на душы. Бо зразумела, што ўсе навокал глядзяць на яго, як, на прынца, які не адчувае ў жыцці ніякіх праблем і цяжкасцяў, ніколі не плача ў падушку...

Але найперш ён чалавек — такі ж, як і мы з вамі. Ходзіць па той жа зямлі, дыхае тым жа паветрам і атрымлівае асалоду ад усяго зямнога. І пяць разоў на дзень дзякуе Алаху за тое, што ён можа гэта рабіць. І хоць у яго простыя манеры ў зносінах з людзьмі, адкрываецца ён далёка не кожнаму, таму што за знешнім спакоем скрываецца сапраўды ранімая душа.

Пасля фінальнага ўзнагароджвання прызавымі кубкамі шэйх Саід быў гатовы да адказаў на пытанні. Ён прыветна ўсміхаецца і жмурыцца ад жнівеньскага сонца.

***— Ваша жыццё можна назваць казкай?***

— Я звычайны чалавек. І для мяне жыццё любога чалавека — казка. Вось вы думаеце, што я стаю перад вамі такі вялікі, каму ўсё звалілася з неба, і ён нават пальцам пры гэтым не варухнуў. Сапраўды, я крышачку адрозніваюся ад іншых тым, што я — сын правіцеля. Але ў мяне не было выбару — мне так было суджана. Гэтаксама як і вам суджана нарадзіцца ў такой цудоўнай краіне, як Беларусь.

***— Многія думаюць, што ў вашым агародзе і рэпа расце таўсцейшая і шырэйшая.***

—Такая ж можа расці і ва ўсіх астатніх. Толькі трэба імкнуцца да гэтага. У кожнага ж у жыцці свая гісторыя. І толькі наша сапраўдная вера ў Бога дапамагае дабівацца пэўных вышынь у жыцці. Вы думаеце, што ў багатых няма ніякіх праблем, і іх не бяруць розныя немачы? Памыляецеся. Да таго ж, усе з нас смяротныя — і багатыя, і бедныя. Але для мяне галоўнае не грошы, а тое, кім я з'яўляюся на самай справе. Галоўнае —захоўваць у сабе сапраўдную веру. У мяне таксама былі сур'ёзныя праблемы са здароўем: дыябет і яго абвастрэнне, вострыя прыступы. Я выйшаў страляць, перасільваючы боль і просячы Алаха аб дапамозе. І ён даў мне выздараўленне.

***— Таму вы моліцеся пяць разоў у дзень?***

— Рэлігія — гэта частка майго жыцця. Чалавек складаецца з душы і цела. Чаму ў такім выпадку мы пастаянна кормім цела, забываючыся пра душу? Ёй, як і целу, таксама патрэбна ежа. Яна — жывая, і таксама адчувае пачуццё голаду. Душы патрэбна духоўная ежа — праз малітвы.

***— Я,магчыма, таксама хачу прыняць мусульманства...***

— Жан Жак Кусто стаў мусульманінам. Мне здаецца, што вера — гэта выбар кожнага. Бог не любіць тых, хто праз сілу прымае іншую веру; тут павінен быць усвядомлены крок. Няважна, хто ты — мусульманін, хрысціянін або будыст. Трэба заўсёды заставацца чалавекам.

***— Чула, што вы адмовіліся ад трона. Чаму?***

— Я з'яўляюся членам правячай сям'і, пакуль мне гэтага дастаткова. У мяне дзве вышэйшыя адукацыі. Знешнюю палітыку я вывучаў у Амерыцы, а бізнэс-адміністраванне — у Англіі.

***— Калі станеце галоўным у Арабскіх Эміратах, што зробіце для Беларусі?***

— Бізнэс будзем рабіць разам (*усміхаецца*). Мне толькі 30 гадоў, так што ўсё яшчэ наперадзе. Мой дзядзька шэйх Махамед практычна з нуля пабудаваў Дубаі, пачаў развіваць краіну, здабываць мінеральныя рэсурсы. Усё, чым багатая наша краіна, — гэта нафта і конегадоўля.

***— У вас ёсць канюшня?***

— Я з'яўляюся ўладальнікам клуба, у якім 150 коней рознай пароды.

***— Гавораць, што вы ў хуткім часе станеце канкурэнтам Рамана Абрамовіча па частцы «Чэлсі»?***

— Так, ёсць і футбольны клуб.

***— А навошта вам 200 ружжаў?***

— Каб эксперыментаваць!

***— А чатыры асабістыя кухары?***

— Не з-за капрызаў, паверце, а ў мэтах бяспекі.

***— Што вы ведалі аб Беларусі да прыезду?***

— Калі шчыра, то сітуацыя нагадвае анекдот. Мяне напалохалі італьянцы, якія сказалі, нібыта ўсё, што знаходзіцца на ўсход ад Польшчы, — гэта мядзведзі і зубры (*смяецца*). Таму я заказаў картэж суправаджэння — шэсць машын аховы. Калі мы выехалі з Брэста, я здзівіўся, наколькі цудоўная і бяспечная ваша краіна! Яна нагадвае мне гольф-пляцоўку, дзе ўсюды зялёныя лугі і шырокія вуліцы. Тут можна прыпаркавацца, дзе табе зручна. Такога няма нават у Дубаі.

***— На беларускіх прынцэс не заглядваліся?***

— Тут шмат прыгожых дзяўчат, але ў мяне ўжо ёсць жонка і чацвёра дзяцей — тры сыны і дачка.

***— У Мінску вы сталі толькі другім. Гэта вас не засмуціла?***

— Шчыра? Я магу страляць лепш!

***— Для вас важна быць пераможцам у спорце і ў жыцці?***

— Калі я перамагаю — дзякуй Алаху! Не перамагаю — таксама дзякуй Алаху! Людзі пастаянна шукаюць рай, але рай унутры нас саміх. Мая душа радуецца ўжо толькі таму, што я магу дыхаць, бачыць неба, рухацца, а самае галоўнае — адчуваць сябе часцінкай усяго цэлага.

***— Якія галоўныя мэты ў вашым жыцці?***

— Перад тым як памру, хачу быць на самай высокай пазіцыі. Не хачу, каб фінальны акорд прагучаў на дрэннай дарозе.

**Вольга РАМАНЮК.**

